УДК 343.131

# ЗАМАЦАВАННЕ ПРЫНЦЫПУ МЭТАЗГОДНАСЦІ Ў КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК ПАДСТАВА РЭАЛІЗАЦЫІ ДЫСКРЭТНЫХ ПАЎНАМОЦТВАЎ

**Скшыдлеўска Эльжбета Вітольдаўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца прынцып мэтазгоднасці як падстава для рэалізацыі дыскрэтных паўнамоцтваў. Аўтар адзначае, што медыяцыя паспяхова развіваецца ў тых дзяржавах, дзе ў якасці аднаго з прынцыпаў крымінальнага працэсу разглядаюць названы прынцып. Таму лагічна дапоўніць КПК Рэспублікі Беларусь нормай аб прынцыпе мэтазгоднасці.*

Адным з альтэрнатыўных спосабаў вырашэння крымінальна-прававых канфліктаў, распаўсюджаным у сусветнай практыцы, з’яўляецца медыяцыя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разам з тым дадзеная працэдура ў нацыянальнай сістэме крымінальнага працэсу да гэтага часу адсутнічае. Варта заўважыць, што медыяцыя паспяхова развіваецца ў тых дзяржавах, дзе ў якасці аднаго з прынцыпаў крымінальнага працэсу разглядаюць прынцып мэтазгоднасці.

Таму існуе неабходнасць у разглядзе працэдуры медыяцыі ў кантэксце прынцыпу мэтазгоднасці.

Прынцып мэтазгоднасці – гэта прадстаўленая законам магчымасць выбару найбольш аптымальнай з прадугледжаных законам для дадзенага канкрэтнага выпадку формы ажыццяўлення крымінальна-працэсуальнай дзейнасці і прадугледжанага законам спосабу вырашэння крымінальна-прававога канфлікту з мэтай эфектыўнага вырашэння задач і дасягнення мэтаў, якія стаяць перад крымінальным судаводствам [2, с. 5].

КПК Рэспублікі Беларусь таксама замацоўвае наяўнасць дыскрэцыйных паўнамоцтваў у органаў крымінальнага пераследу, у прыватнасці: суд, пракурор або следчы мае права спыніць вытворчасць па крымінальнай справе і вызваліць асобу ад крымінальнай адказнасці па падставах, вызначаных у арт. 30 КПК Рэспублікі Беларусь [3]. Аднак прынцып мэтазгоднасці ў КПК Рэспублікі Беларусь не замацаваны, а менавіта ў рамках гэтага прынцыпу рэалізуюцца дыскрэтныя паўнамоцтвы.

Як указвае В. І. Самарын, «дыспазітыўнасць варта адрозніваць ад дыскрэтнасці» [1, с. 76]. Дыспазітыўнасць дае магчымасць выбару паводзін у рэалізацыі правоў удзельнікамі крымінальнага працэсу, якія не з'яўляюцца службовымі асобамі (гэта значыць права бакоў крымінальна-прававога канфлікту ўплываць на ход працэсу, якое дазваляе ўрэгуляваць канфлікт на аснове ўзаемнай згоды бакоў), а дыскрэтнасць дае магчымасць выкарыстоўваць паўнамоцтвы для выканання задач крымінальнага працэсу – службовым асобам і дзяржаўным органам.

У той жа час у сілу прынцыпу публічнасці (арт. 15 КПК Рэспублікі Беларусь) дзяржава абавязана рэагаваць на злачынствы, не пакідаючы яго без наступстваў. Таму дасягненне бакамі кампрамісу не вызваляе органы крымінальнага пераследу ад абавязку даказваць віну асобы ў здзяйсненні злачынства, але так як дадзены прынцып знаходзіць сваё адлюстраванне ў пераважнай большасці крымінальна-працэсуальных нормаў, то па большай катэгорыі крымінальных спраў не ўлічваецца жаданне пацярпелага быць прызнаным такім удзельнікам крымінальнага працэсу, а таксама яго воля на крымінальны пераслед асобы, якая ўчыніла злачынства.

Аднак варта заўважыць, што дзяржава ў сілу прынцыпу мэтазгоднасці можа рэагаваць і ў іншай, альтэрнатыўнай форме – медыяцыі. Таму ў выпадку, калі бакі прыйшлі да рашэння накіраваць крымінальную справу ў медыяцыю і заключылі медыятыўнае пагадненне – вытворчасць па



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крымінальнай справе можа спыняцца – гэта і называецца мэтазгоднасцю, а ў сілу прынцыпу публічнасці адбываецца далейшае расследаванне, хоць пацярпелы не мае прэтэнзій да асобы – якая ўчыніла злачынства – гэта значыць, не выконваюцца інтарэсы ніводнага боку.

У шэрагу краін адсутнасць легальнага замацавання дадзенага прынцыпу і яго выразнага разумення прывяло да празмернай фармалізацыі парадку вытворчасці па крымінальных справах. У параўнанні, на прыклад, у Францыі ў 28% выпадкаў пракуратура адмаўляе ў распачынанні крымінальнага пераследу па матывах немэтазгоднасці [5, с. 334]. У Германіі – спыненне крымінальнага пераследу па прычыне немэтазгоднасці становіцца ўсё больш звыклай практыкай, якая рэалізуецца ў дачыненні да кожнага другога непаўналетняга абвінавачанага [5, с. 334].

Высокая выніковасць прымянення медыяцыі ў краінах, дзе ў крымінальным працэсе прызнаецца прынцып мэтазгоднасці, уяўляецца цалкам заканамернай, так як наяўнасць дадзенага прынцыпу адкрывае больш шырокі дыяпазон для меркавання пры вытворчасці па крымінальнай справе і не патрабуе ў шэрагу выпадкаў дэталёвай рэгламентацыі асобных працэдур. Так, заканадавец можа вызначыць толькі агульныя прынцыпы прымянення медыяцыі ў крымінальным працэсе.

У тых дзяржавах, дзе любы адыход ад прынцыпу законнасці лічыцца недапушчальным, укараненне медыяцыі ўскладнена неабходнасцю яе дэталёвай рэгламентацыі ў крымінальным працэсе. Таму для ўкаранення працэдуры медыяцыі ў крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь неабходна падрыхтаваць праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у КПК Рэспублікі Беларусь» і распрацаваць мадэль медыяцыі ў крымінальным працэсе.

Такім чынам, легальнае замацаванне прынцыпу мэтазгоднасці ў крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь значна спросціць механізм укаранення медыяцыі ў крымінальны працэс і паспрыяе эфектыўнаму развіццю гэтай працэдуры. Аднак замацаванне названага прынцыпу магчыма толькі пры наяўнасці пэўных умоў, перш за ўсё, – высокай прававой культуры грамадства – так як дадзены прынцып пашырае магчымасць меркавання пры вытворчасці па крымінальнай справе.

На падставе вышэйпададзенага, бачыцца магчымым сфармуляваць ч. 2 арт. 15 КПК Рэспублікі Беларусь у новай рэдакцыі: «2. Дзяржаўныя органы, службовыя асобы, упаўнаважаныя ажыццяўляць крымінальнае праследаванне, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры па выяўленні злачынстваў і выяўленні асоб, якія іх учынілі, узбуджэння крымінальнай справы, прыцягненні вінаватых да прадугледжанай законам адказнасці і стварэнні ўмоў для пастановы судом законнага, абгрунтаванага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і справядлівага прысуду. За выключэннем выпадкаў, калі дадзены Кодэкс прадастаўляе органу, які вядзе крымінальны працэс, права спыніць вытворчасць па крымінальнай справе».

## Спіс крыніц


1. Самарин, В. И. Принцип целесообразности против принципа публичности в современном уголовном процессе / В. И. Самарин // Уголовный процесс как средство обеспечения прав человека в правовом государстве: Междунар. науч.-практ. конф., 9-12 нояб. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т, юрид. фак., каф. уголов. процесса и прокурор. надзора; редкол.: В. И. Самарин (отв. ред.), М. Хегер, О. В. Мороз. – Минск : Изд. центр БГУ, 2017. – С. 73–80.
2. Смолин, А. Ю. Принцип процессуальной экономии в уголовном судопроизводстве России: дис. … канд. юрид. наук : 12.00.09 / А. Ю. Смолин ; [Место защиты: Нижегор. акад. МВД России]. – Н. Новгород, 2010. – 200 с.
3. Уголовно-процессуальный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 16 июля 1999 г., № 295-З : принят Палатой представителей 24 июня 1999 г.: одобр. Советом Респ. 30 июня 1999 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 20.04.2016 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.
4. Уголовный процесс западных государств : учеб. пособие для юридических вузов / К. Ф. Гуценко, Л. В. Головко, Б. А. Филимонов. – 2-е изд., доп. и испр. – М. : Зерцало-М, 2002. – 528 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова